Д. А. Карпечкіна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2014

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
“МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
імя А. А. КУЛЯШОВА”

Д. А. Карпечкіна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Кантрольныя заданні

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2014

УДК 811.161.3–112(075.8)
ББК 81.411.3–03
К26

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета МДУ імя А. А. Куляшова

Р э ц э н з е н т

кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны"
Л. П. Кузьміч

Карпечкіна, Д. А.

К26 Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : кантрольныя заданні / Д. А. Карпечкіна. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. – 56 с.

Кантрольныя заданні ўяўляюць сабой сукупнасць збалансаваных тэставых заданняў па гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Выданне прызначана для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання, можа быць выкарыстана пры выніковай атэстацыі і правядзенні курсавога экзамена па дысцыпліне "Гісторыя беларускай мовы".

УДК 811.161.3–112(075.8)
ББК 81.411.3–03

© Карпечкіна, Д. А., 2014
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2014

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Куляшова

1 блок
УВОДЗІНЫ

1. Прадметам вывучэння курса "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы" з'яўляецца:

А) структура беларускай мовы ва ўсёй сукупнасці яе адгалінаванняў

Б) фарміраванне, развіццё і ўдасканаленне літаратурнай мовы

В) працэс навучання беларускай мове

Г) прырода і сутнасць мовы

Д) роля мовы ў грамадскім жыцці людзей

2. Задачай курса "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы" НЕ з'яўляецца:

А) вывучэнне працэсу складвання і развіцця сістэмы моўна-выяўленчых сродкаў літаратурнай мовы ў розных жанрах пісьменнасці

Б) выяўленне адметнасцей асобных стыляў літаратурнай мовы ў розныя гістарычныя часы

В) складанне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вучняў

Г) выяўленне ўзаемаадносін паміж літаратурнай і дыялектнай мовамі

Д) вызначэнне ступені захавання ў літаратурнай мове пісьмовых традыцый папярэдніх эпох

3. Адметнай рысай сучаснай беларускай літаратурнай мовы НЕ з'яўляецца:

А) наяўнасць шырокіх грамадскіх функцый

Б) наяўнасць пісьмова замацаваных норм

В) наяўнасць пісьмова-кніжнай і вусна-размоўнай форм

Г) стылістычная дыферэнцыяцыя

Д) тэрытарыяльная неаднастайнасць і абмежаванасць пашырэння

4. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы з'яўляецца часткай курса "Гісторыя беларускай мовы" разам з:

А) гістарычнай граматыкай беларускай мовы

Б) гісторыяй Беларусі

В) палеаграфіяй

Г) методыкай выкладання беларускай мовы

Д) агульным мовазнаўствам

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Курс "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы" НЕ звязаны з:
А) сучаснай беларускай літаратурнай мовай
Б) беларускай дыялекталогіяй
В) гістарычнай граматыкай беларускай мовы
Г) гісторыяй беларускай літаратуры
Д) педагогікай

6. Разгляд гісторыі беларускай літаратурнай мовы пачынаецца з:
А) часоў існавання Кіеўскай Русі
Б) часоў існавання Вялікага Княства Літоўскага
В) часу ўтварэння Рэчы Паспалітай
Г) часу ўключэння Беларусі ў склад Расійскай дзяржавы
Д) часу ўтварэння БССР

7. У аснове нацыянальнай беларускай літаратурнай мовы:
А) руская літаратурная мова
Б) старабеларуская літаратурная мова
В) польская мова
Г) гаворкі цэнтральнай Беларусі
Д) украінская мова

8. Для літаратурнай мовы эпохі нацыі НЕ характэрна:
А) апрацаванасць
Б) упарадкаванасць
В) нарматыўнасць
Г) універсальнасць (абслугоўванне ўсіх сфер зносін)
Д) толькі вусная форма бытавання

9. Асноўнымі крыніцамі вывучэння гісторыі беларускай літаратурнай мовы з'яўляюцца:
А) афіцыйна-дзелавыя паперы
Б) газетныя публікацыі
В) археалагічныя знаходкі
Г) беларускія інтэрмедыі
Д) творы старажытнай і сучаснай літаратуры розных стыляў і жанраў

10. Пры выяўленні нацыянальнай прыналежнасці помнікаў усходнеславянскага пісьменства НЕ з'яўляюцца вызначальнымі:
А) моўная спецыфіка помніка
Б) тэрытарыяльны паказчык (месца стварэння)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) нацыянальная прыналежнасць аўтара
Г) палеаграфічныя адрозненні
Д) стылістычная прыналежнасць помніка

2 блок
ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Падзел моўнага працэсу на асобныя часавыя прамежкі, што маюць пэўную закончанасць, унутранае адзінства, называюць:
А) сінхранізацыяй гісторыі беларускай літаратурнай мовы
Б) перыядызацыяй гісторыі беларускай літаратурнай мовы
В) спецыялізацыяй гісторыі беларускай літаратурнай мовы
Г) храналагізацыяй гісторыі беларускай літаратурнай мовы
Д) дэталізацыяй гісторыі беларускай літаратурнай мовы

2. У гісторыі беларускай літаратурнай мовы традыцыйна вылучаецца наступная колькасць перыядаў:
А) 2
Б) 3
В) 4
Г) 5
Д) 6

3. Пачатковы перыяд развіцця гісторыі беларускай літаратурнай мовы традыцыйна называецца:
А) старажытнарускім
Б) стараславянскім
В) старабеларускім
Г) паўднёваславянскім
Д) царкоўнаславянскім

4. У апошні час пачатковы перыяд развіцця гісторыі беларускай літаратурнай мовы называецца:
А) старажытным перыядам беларускай мовы
Б) царкоўнаславянскім перыядам беларускай мовы
В) старарускім перыядам беларускай мовы
Г) паўночнаславянскім перыядам беларускай мовы
Д) савецкім перыядам беларускай мовы

5. Адзін з перыядаў развіцця беларускай літаратурнай мовы мае назву:
А) паўднёваславянскага
Б) заходнеславянскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) царкоўнаславянскага
Г) заходнярускага
Д) старабеларускага

6. Часавыя рамкі старажытнага перыяду беларускай мовы:
А) XI – пач. XVI стст.
Б) X–XI стст.
В) XIV–XVII стст.
Г) XI – пач. XIV стст.
Д) XIV–XVIII стст.

7. Часавыя рамкі старабеларускага перыяду беларускай мовы:
А) XIX–XX стст.
Б) XVII–XVIII стст.
В) 2-я пал. XIV–XVIII стст.
Г) XVIII–XIX стст.
Д) XVI–XVIII стст.

8. Літаратурна-моўная гісторыя ўсходніх славян пачынаецца з:
А) VIII ст.
Б) XI ст.
В) XVI ст.
Г) XIII ст.
Д) XIV ст.

9. Старажытны перыяд беларускай мовы падзяляецца на этапы:
А) XI–XII стст.; XIII – пач. XIV стст.
Б) XI ст.; XII ст.; XIII ст.; XIV ст.
В) X–XI стст.; XII–XIII стст.
Г) XIV–XV стст.; XVI – пач. XVII стст.
Д) VI–VIII стст.; IX – пач. XI стст.

10. Перыяд IX-X стст. у гісторыі беларускай літаратурнай мовы мае назву:
А) познелацінскага
Б) старабеларускага
В) новага
Г) навейшага
Д) агульнаўсходнеславянскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3 блок
НАВУКОВАЯ РАСПРАЦОЎКА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы як асобны раздзел беларускага мовазнаўства склалася:

А) у часы існавання Кіеўскай Русі
Б) у часы існавання Вялікага Княства Літоўскага
В) у часы існавання Рэчы Паспалітай
Г) у перыяд існавання новай беларускай літаратурнай мовы

2. Вывучэннем мовы помнікаў старажытнай беларускай пісьменнасці НЕ займаўся:

А) А.І. Сабалеўскі
Б) А.А. Шахматаў
В)А. Гурыновіч
Г) Я.Ф. Карскі

3. Вывучэннем "заходнярускіх" летапісаў займаўся:

А) А.А. Шахматаў
Б) І.І. Насовіч
В) В.І. Баркоўскі
Г) В.У. Вінаградаў

4. У дарэвалюцыйны час моўныя асаблівасці смаленска-полацкіх грамат XIII–XV стст. прааналізаваў:

А) Р.І. Аванэсаў
Б) А.І. Сабалеўскі
В) С.П. Абнорскі
Г) А.І. Жураўскі

5. Адным з аўтараў манаграфіі «Мова выданняў Ф. Скарыны» НЕ з'яўляецца»:

А) У.М. Свяжынскі
Б) А.М. Булыка
В) У.В. Анічэнка
Г) А.І. Жураўскі

6. Аўтарам падручніка "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы" з'яўляецца:

А) Л.М. Шакун
Б) В.І. Рагаўцоў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) В.П. Красней
Г) Л.А. Антанюк

7. Беларускі вучоны І.І. Насовіч з'яўляецца аўтарам:
А) манаграфіі "Беларусы"
Б) манаграфіі "Баркалабаўскі летапіс"
В) "Беларускай граматыкі для школ"
Г) гістарычнага слоўніка беларускай мовы

8. Найбольш вядомая праца акадэміка Я.Ф. Карскага называецца:
А) "Францыск Скарына і яго час"
Б) "Беларусы"
В) "Агляд гукаў і форм беларускай гаворкі"
Г) "Методыка роднай мовы"

9. Першы том манаграфіі Я.Ф. Карскага "Беларусы" з'явіўся ў:
А) 1890 г.
Б) 1903 г.
В) 1916 г.
Г) 1941 г.

10. Навуковай распрацоўкай пытанняў гісторыі беларускай літаратурнай мовы НЕ займаўся:
А) І.І. Крамко
Б) А.І. Жураўскі
В) У.В. Гніламёдаў
Г) М.Р. Прыгодзіч

4 блок
УЗНІКНЕННЕ ПІСЬМЕННАСЦІ ВА ЎСХОДНІХ СЛАВЯН. ПАХОДЖАННЕ СТАРАЖЫТНАРУСКАЙ МОВЫ

1. Самыя раннія пісьмова-кніжныя крыніцы вывучэння гісторыі беларускай літаратурнай мовы адносяцца да:
А) IX ст.
Б) X ст.
В) XI ст.
Г) XII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. НЕ з'яўляецца помнікам пісьменства XII ст.:

А) Наўгародскія службовыя мінэі

Б) Тмутараканскі надпіс

В) зборнікі кіеўскага князя Святаслава

Г) метрыка Вялікага Княства Літоўскага

3. Самы ранні нісьмова-кніжны помнік XII ст. – гэта:

А) Астрамірава евангелле

Б) Дабрылава евангелле

Г) летапіс Аўраамкі

Д) дагаворная грамата з Рыгай і Гоцкім берагам

4. Пры раскопках курганаў пад Смаленскам у 1949 г. быў знойдзены:

А) Слуцкі псалтыр

Б) Тмутараканскі надпіс

В) Гняздоўскі надпіс

Г) надпіс на крыжы Е. Полацкай

5. Уяўленне пра бытавое выкарыстанне пісьма насельніцтвам старажытнай Русі пашырылася, дзякуючы знаходкам:

А) евангелляў

Б) берасцяных грамат

В) казанняў і павучэнняў айцоў царквы

Г) псалтыроў

6. Меркавання, што ў аснове старажытнай мовы ўсходніх славян ляжыць стараславянская мова, НЕ прытрымліваўся:

А) Л.У. Шчэрба

Б) А.А. Шахматаў

В) А.І. Сабалеўскі

Г) С.П. Абнорскі

7. С.П. Абнорскі сцвярджаў, што старажытная мова ўсходніх славян узнікла на аснове:

А) іх жывой гаворкі

Б) стараславянскай мовы і жывой гаворкі

В) стараславянскай мовы

Г) балгарскай мовы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8. Да рукапісных богаслужэбных кніг XII ст. НЕ адносіцца:
А) "Евангелле"
Б) "Апостал"
В) "Руская праўда"
Г) "Псалтыр"

9. У старажытнай Русі карысталіся:
А) уласна старажытнарускай і царкоўнаславянскай мовамі
Б) старабеларускай і царкоўнаславянскай мовамі
В) балгарскай і старажытнарускай мовамі
Г) толькі царкоўнаславянскай мовай

10. Стражытныя помнікі XII ст. – гэта пераважна:
А) кнігі канцылярска-юрыдычнага пісьменства
Б) богаслужэбныя кнігі
В) паэтычныя творы
Г) навуковая і палемічная літаратура

5 блок
ЦАРКОЎНАСЛАВЯНСКАЯ КНІЖНАСЦЬ СТАРАЖЫТНАГА ПЕРЫЯДУ

1. Для помнікаў кніжна-славянскага стылістычнага тыпу НЕ характэрна наяўнасць:
А) поўнагалосся
Б) спалучэнняў *жд*, *шт*
В) няпоўнагалосся
Г) пачатковых спалучэнняў *ра*, *ла*

2. У богаслужэбных рукапісных кнігах XII ст. адлюстраваны:
А) аканне
Б) дзеканне
В) нясцягнутыя формы імперфекта
Г) пачатковы *о*

3. Да стараславянізмаў НЕ адносіцца лексема:
А) бытие
Б) ангелъ
В) ересь
Г) осень

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Да помнікаў кніжна-славянскага стылістычнага тыпу НЕ адносіцца:

А) "Жыціе Феадосія Пячэрскага"
Б) "Слова пра закон і дар Божы"
В) "Аршанскае евангелле"
Г) "Аповесць мінулых гадоў"

5. У помніках кніжна-славянскага стылістычнага тыпу пераважаюць:

А) стараславянскія моўныя рысы
Б) рысы жывой гаворкі
В) уласна старажытнарускія моўныя рысы
Г) паланізмы

6. Да арыгінальных твораў царкоўнай белетрыстыкі адносіцца:

А) Юр'еўскае евангелле
Б) Слуцкі псалтыр
В) "Казанне аб Барысе і Глебе"
Г) Астрамірава евангелле

7. Для фанетычнай сістэмы помнікаў кніжна-славянскага стылістычнага тыпу характэрна наяўнасць:

А) гука ч на месцы **t* і **kt* з *j*
Б) пачатковых спалучэнняў *ро*, *ло*
В) пачатковага *у*
Г) пачатковага *а*

8. Самыя раннія помнікі царкоўнаславянскай кніжнасці адносяцца да:

А) VI ст.
Б) IX ст.
В) XI ст.
Г) XII ст.

9. У галіне граматыкі для помнікаў кніжна-славянскага стылістычнага тыпу НЕ характэрна наяўнасць:

А) нясцягнутых форм прыметнікаў
Б) нясцягнутых форм імперфекта
В) канцавога *-тъ* у дзеясловах 3-й асобы адз. і мн. ліку
Г) канчатка *-ого* ў Р скл. адз. ліку прыметнікаў м. і н. роду

10. Самым старажытным па часе ўзнікнення з'яўляецца:

А) Мсціслава евангелле
Б) Астрамірава евангелле

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

В) Дабрылава евангелле
Г) Юр'еўскае евангелле

6 блок
АПАВЯДАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА СТАРАЖЫТНАГА ПЕРЫЯДУ

1. Да помнікаў свецкай апавядальна-гістарычнай літаратуры НЕ адносяцца:
А) творы У. Манамаха
Б) "Слова аб палку Ігаравым"
В) "Маленне" Даніила Затворніка
Г) "Руская праўда"

2. Для твораў свецка-літаратурнага стылістычнага тыпу характэрна:
А) спалучэнне стараславянскіх і старажытнарускіх моўных рыс
Б) перавага рыс стараславянскай мовы
В) перавага рыс старажытнарускай мовы
Г) наяўнасць іншамоўных уплываў

3. Для апавядальна-гістарычнай літаратуры НЕ характэрна ўздзеянне паэтычнай мовы фальклору:
А) у бытавых замалёўках
Б) у запісах царкоўна-рэлігійнага характару
В) у дыялогу
Г) у апавяданнях аб паходах рускіх князёў

4. Помнікам свецкай апавядальна-гістарычнай літаратуры з'яўляецца:
А) "Жыціе Ефрасінні Полацкай"
Б) "Павучэнне" У. Манамаха
В) "Слова" К. Тураўскага на Антыпасху
Г) Тмутараканскі надпіс

5. Узнікненне "Слова аб палку Ігаравым" адносяць да:
А) X ст. В) XII ст.
Б) XI ст. Г) XIII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

6. Для мовы "Слова аб палку Ігаравым" НЕ характэрна:
А) паўднёваславянскі ўплыў
Б) багаты слоўнікавы склад
В) вобразнасць мовы
Г) ужыванне паланізмаў

7. Большасць твораў свецка-літаратурнага стылістычнага тыпу:
А) дайшлі да нас у пазнейшых спісах
Б) дайшлі да нас у арыгінале
В) не захаваліся нават у копіях
Г) падпалі пад другі паўднёваславянскі ўплыў

8. Уздзеянне паэтычнай мовы фальклору на мову апавядальна-гістарычнай літаратуры праяўляецца ў выкарыстанні:
А) элементаў кніжна-славянскай стылізацыі
Б) элементаў царкоўнай рыторыкі
В) вобразнай народнай лексікі і фразеалогіі
Г) элементаў агіяграфіі

9. Аўтабіяграфічная частка твораў У. Манамаха выкладаецца:
А) пераважна на стараславянскай мове
Б) пераважна на старажытнарускай мове
В) з выкарыстаннем біблейскіх цытат
Г) у высокім, урачыстым тоне

10. "Маленне" Даніїла Затворніка захавалася ў спісах:
А) XII–XIII стст.
Б) XIII–XIV стст.
В) XV–XVI стст.
Г) XVI–XVII стст.

7 блок
ДЗЕЛАВОЕ ПІСЬМЕНСТВА СТАРАЖЫТНАГА ПЕРЫЯДУ

1. Помнікам дзелавога пісьменства, які захаваўся ад XII ст., з'яўляецца:
А) Статут ВКЛ
Б) "Павучэнне" У. Манамаха

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) Тмутараканскі надпіс
Г) укладная грамата княгіні Ульяніі

2. Да дзелавых помнікаў старажытнага перыяду НЕ адносіцца:
А) Статут ВКЛ
Б) "Руская праўда"
В) Тмутараканскі надпіс
Г) дагаворная грамата з Рыгай і Гоцкім берагам

3. Рысы дзелавога нісьменства і царкоўнаславянскай кніжнасці адлюстраваны ў:
А) Тураўскім евангеллі
Б) надпісе на крыжы Е. Полацкай
В) Наўгародскіх службовых мінэях
Г) Дабрылавым евангеллі

4. Для мовы помнікаў дзелавога стылістычнага тыпу старажытнага перыяду характэрна:
А) перавага рыс жывой гаворкі
Б) перавага стараславянскіх рыс
В) спалучэнне стараславянскіх рыс і рыс жывой гаворкі
Г) уздзеянне паэтычнай мовы фальклору

5. Самым важным дзелавым помнікам старажытнага перыяду з'яўляецца:
А) укладная грамата манаха Варлаама
Б) Літоўская метрыка
В) Тмутараканскі надпіс
Г) "Руская праўда"

6. Першы дакладна датаваны дзелавы помнік старажытнага перыяду – гэта:
А) укладная грамата княгіні Ульяніі
Б) укладная грамата манаха Варлаама
В) дагаворная грамата з Рыгай і Гоцкім берагам
Г) грамата князя Гердэня

7. "Руская праўда" была складзена ў:
А) XI–XII стст.
Б) XIII–XIV стст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) XV–XVI стст.
Г) XIX–XX стст.

8. Ад XII ст. захавалася арыгінальных помнікаў дзелавога пісьменства:

А) 1 В) 3
Б) 2 Г) 4

9. Графіці – гэта:

А) берасцяныя граматы
Б) богаслужэбныя кнігі
В) надпісы на прадметах матэрыяльнай культуры
Г) кнігі для навучання грамаце

10. Для помнікаў дзелавога пісьменства старажытнага перыяду характэрна:

А) метафарычнасць
Б) вобразнасць слова
В) ужыванне перыфраз
Г) дакладнасць, канкрэтнасць

8 блок
ПІСЬМЕНСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ XII–XIII стст. МЯСЦОВЫЯ РЫСЫ Ў НІСЬМОВЫХ ПОМНІКАХ АСОБНЫХ РЭГІЁНАЎ

1. Пісьменнасць на землях Беларусі ў XII–XIII стст.:

А) не мела значнага пашырэння
Б) канцэнтравалася толькі вакол манастыроў
В) была прывілеяй толькі сацыяльных вярхоў
Г) была шырока распаўсюджанай з'явай

2. Берасцяныя граматы на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены:

А) у Віцебску і Мсціславе
Б) у Віцебску і Магілёве
В) у Магілёве і Мсціславе
Г) у Пінску і Навагрудку

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Выхадцам з заходніх (беларускіх) земляў Кіеўскай Русі НЕ з'яўляецца:

А) К. Тураўскі
Б) І. Златавуст
В) К. Смаляціч
Г) А. Смаленскі

4. Надніс на крыжы Е. Полацкай спарадычна адлюстроўвае такія рысы жывой беларускай гаворкі, як:

А) дзеканне, цеканне
Б) змяненне *в* на *ў*, *л* на *ў*
В) зацвярдзенне губных на канцы слова, аканне
Г) зацвярдзенне шыпячых, падаўжэнне зычных

5. Да тэрыторыі былых заходніх (беларускіх) земляў Кіеўскай Русі НЕ мае дачыненне старажытны нісьмова-кніжны помнік:

А) Слуцкі псалтыр
Б) Тураўскае евангелле
В) Супрасльскі рукапіс
Г) Астрамірава евангелле

6. Да смаленска-полацкіх дзелавых помнікаў XIII ст. мае дачыненне:

А) дагаворная грамата з Рыгай і Готкім берагам
Б) "Слова аб пагібелі рускай зямлі"
В) укладная грамата Хутынскаму манастыру
Г) даравальная грамата наўгародскаму Юр'еву манастыру

7. Якія "землі" НЕ маюць дачынення да тэрыторыі заходняй часткі Кіеўскай Русі:

А) Полацка-Мінская
Б) Растова-Суздальская
В) Смаленская
Г) Турава-Пінская

8. Для смаленска-полацкага дыялекта НЕ было ўласціва:

А) змяненне *в* на *ў*
Б) оканне
В) выбухны *г*
Г) аканне

9. Для дыялекта Турава-Пінскага княства НЕ было ўласціва:

А) фрыкатыўны *г*
Б) падаўжэнне зычных
В) адрозненне *ц* і *ч*
Г) змяшэнне *ц* і *ч*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Ёсць звесткі, што ў XII–XIII стст. існавала мясцовае летапісанне ў:

А) Полацку В) Пінску

Б) Віцебску Г) Крычаве

9 блок
УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ І ЯЕ МОВЫ

1. Пасля распаду Кіеўскай Русі землі сучаснай Беларусі апынуліся ў складзе:

А) Літоўскай дзяржавы

Б) Польскага каралеўства

В) Расійскай імперыі

Г) Рэчы Паспалітай

2. У складзе Літоўскай дзяржавы апынуліся былыя землі Кіеўскай Русі:

А) паўночна-ўсходнія

Б) цэнтральныя

В) паўднёва-заходнія

Г) заходнія і паўднёва-заходнія

3. Вядучую ролю ў палітычным і культурным жыцці Вялікага Княства Літоўскага адыгрывалі прадстаўнікі:

А) літоўскага насельніцтва

Б) беларускага насельніцтва

В) яўрэйскага насельніцтва

Г) украінскага насельніцтва

4. Дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага была:

А) літоўская

Б) польская

В) старабеларуская

Г) украінская

5. Назва Белая Русь у адносінах да беларускіх земляў з'явілася ў іншаземных крыніцах у:

А) XI ст. В) XIV ст.

Б) XII ст. Г) XVII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

6. Мясцовае беларускае насельніцтва ў XIV ст. называла сябе:

А) "руськими" В) беларусамі

Б) літоўцамі Г) палешукамі

7. Этнонім беларускага народа "беларусы" сфарміраваўся ў:

А) X–XII стст.

Б) XII–XIII стст.

В) XIV–XVI стст.

Г) к. XVI – пач. XVII стст.

8. Жыхары розных рэгіёнаў тэрыторыі сучаснай Беларусі ў старабеларускі перыяд НЕ называліся:

А) ліцвінамі В) палешукамі

Б) яўрэямі Г) беларусцамі

9. Вядучымі ва ўтварэнні старабеларускай мовы сталі дыялектныя адрозненні:

А) заходняй часткі агульнаўсходнеславянскай тэрыторыі

Б) усходняй часткі агульнаўсходнеславянскай тэрыторыі

В) цэнтральнай часткі агульнаўсходнеславянскай тэрыторыі

Г) паўночна-ўсходняй часткі агульнаўсходнеславянскай тэрыторыі

10. Старабеларуская літаратурная мова, у адрозненне ад царкоўнаславянскай, называлася сучаснікамі:

А) "языком словенским"

Б) "языком славянорусским"

В) "рускай" мовай

Г) "языком славянороссийским"

10 блок
ДЗЕЛАВОЕ І ЮРЫДЫЧНАЕ ПІСЬМЕНСТВА СТАРАБЕЛАРУСКАГА ПЕРЫЯДУ

1. Да дзелавога і канцылярска-юрыдычнага пісьменства XV–XVI стст. НЕ адносяцца:

А) Судзебнікі

Б) Літоўская метрыка

В) Берасцяныя граматы

Г) Трыбунал абываценям ВКЛ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Гістарычны архіў вялікакняжацкай канцылярыі вядомы пад назвай:

А) Літоўская метрыка

Б) Статут ВКЛ

В) Судзебнік караля Казіміра Ягайлавіча

Г) Хранограф

3. Узоры жывой беларускай мовы XV–XVI стст. у большай ступені характэрны для:

А) мемуарнай літаратуры

Б) дзелавога і юрыдычнага пісьменства

В) навуковых і палемічных твораў

Г) рэлігійнай літаратуры

4. Эпоха росквіту дзелавога пісьменства па старабеларускай мове прыпадае на:

А) XIV ст.

Б) XV ст.

В) XVI ст.

Г) XVII ст.

5. Трэцяя рэдакцыя Статута ВКЛ датуецца:

А) 1529 г.

Б) 1566 г.

В) 1586 г.

Г) 1588 г.

6. Для мовы Статутаў ВКЛ НЕ характэрна:

А) уніфікацыя графікі

Б) шырокае пранікненне паланізмаў

В) фанетызацыя правапісу

Г) багацце лексічнага складу

7. Статут ВКЛ 1588 года быў надрукаваны:

А) у Віленскай друкарні братоў Мамонічаў

Б) у Магілёўскай брацкай друкарні

В) у Куцеінскай друкарні С. Собалем

Г) у Заблудаўскай друкарні

8. Найбольш вялікім помнікам дзелавога пісьменства старабеларускага перыяду (па колькасці матэрыялаў) з'яўляецца:

А) Статут ВКЛ

Б) Судзебнік караля Казіміра Ягайлавіча

В) Літоўская метрыка

Г) Дагавор Полацка з Рыгай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

9. Да дзелавых помнікаў XIV ст. НЕ адносіцца:
А) дагавор Полацка з Рыгай
Б) укладная грамата княгіні Ульяніі
В) даравальная грамата літоўскім канонікам
Г) Статут ВКЛ

10. Для дзелавых папер XIV ст. НЕ характэрны:
А) традыцыйныя зачыны
Б) традыцыйныя канцоўкі
В) юрыдычныя формулы
Г) традыцыі польска-лацінскага справаводства

11 блок
ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ, ЛЕТАПІСЫ, МЕМУАРНАЯ ЛІТАРАТУРА СТАРАБЕЛАРУСКАГА ПЕРЫЯДУ

1. Да новага жанру мастацкай літаратуры – белетрыстыкі – НЕ адносіцца:
А) Аповесць аб Баве
Б) Аповесць аб Трышчане
В) Прамова Мялешкі
Г) Александрыя

2. Літаратурна-мастацкі твор "Аповесць аб Баве" перакладзены на старабеларускую мову з:
А) македонскай мовы
Б) сербскай мовы
В) харвацкай мовы
Г) румынскай мовы

3. Росквіт летапісання на Беларусі прыпадае на:
А) XI–XII стст.
Б) XIII–XIV стст.
В) XIV–XV стст.
Г) XV–XVI стст.

4. Адзін з найбольш ранніх спісаў беларускіх летапісаў – гэта:
А) Віленскі
Б) Рачынскага
В) Увараўскі
Г) Красінскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Найбольш набліжана да жывой беларускай гаворкі мова:
А) дзяржаўных літоўскіх летапісаў
Б) летапісаў кароткай рэдакцыі
В) прыватных арыгінальных хронік
Г) летапісаў пашыранай рэдакцыі

6. Прыватнай арыгінальнай хронікай XVII ст. з'яўляецца:
А) Супрасльскі спіс летапісу
Б) Слуцкі спіс летапісу
В) Увараўскі спіс летапісу
Г) Баркалабаўскі летапіс

7. Да арыгінальных празаічных твораў палітычнай сатыры XVII ст. адносіцца:
А) Аповесць аб Атыле
Б) Ліст да Абуховіча
В) Рыфмалагіён
Г) Літоўская метрыка

8. НЕ нісалі вершы ў старабеларускі перыяд развіцця беларускай мовы:
А) А. Рымша
Б) Я. Чачот
В) С. Полацкі
Г) Ф. Скарына

9. Для мовы "Дзённіка" Ф. Еўлашоўскага НЕ характэрна:
А) наяўнасць беларускай і польскай лексікі
Б) перадача беларускіх і польскіх правапісных асаблівасцей
В) адлюстраванне беларускіх і польскіх граматычных рыс
Г) паслядоўная перадача рыс жывой беларускай гаворкі

10. Для мовы літаратурна-мастацкіх твораў старабеларускага перыяду НЕ характэрна:
А) цесная сувязь з царкоўнаславянскай стылістыкай
Б) выкарыстанне грубаватых слоў, уласцівых народнаму гумару
В) увядзенне ўласнамоўных неалагізмаў
Г) выкарыстанне запазычанняў з іншых моў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

12 блок
РЭЛІГІЙНАЯ ЛІТАРАТУРА СТАРАБЕЛАРУСКАГА ПЕРЫЯДУ

1. Рукапіс XV ст. з трох рэлігійна-бытавых аповесцей НЕ ўключае:
А) Аповесць пра трох каралёў-вешчуноў
Б) Пакуты Хрыста
В) Мінэі-Чэцці
Г) Жыціе Аляксея, чалавека божага

2. Самая распаўсюджаная кніга ў паслядоўнікаў розных хрысціянскіх веравызнанняў, перакладзеная ў XVI–XVII стст. на беларускую мову – гэта:
А) Псалтыр
Б) Апостал
В) Катэхізіс
Г) Евангелле

3. Перакладамі рэлігійнай літаратуры на беларускую мову НЕ займаўся:
А) В. Цяпінскі
Б) Ф. Скарына
В) С. Будны
Г) А. Рымша

4. Паралельна на царкоўнаславянскай і "простай" мове надрукавана:
А) "Евангелле" В. Цяпінскага
Б) "Катэхізіс" С. Буднага
В) "Апостал" Ф. Скарыны
Г) "Псалтыр" Ф. Скарыны

5. Пераклад на беларускую мову "Катэхізіса" С. Будны ажыццявіў у:
А) Празе
Б) Вільні
В) Нясвіжы
Г) Заблудаве

6. Хто ў 1616 г. у Еўі выдаў свой пераклад "Евангелля", звязаны з народнай гаворкай і афарбаваны паланізмамі:
А) І. Фёдараў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) С. Собаль
В) І. Капіевіч
Г) М. Сматрыцкі

7. Пашырэнне біблейскіх кніг у пач. XVI ст. звязана перш за ўсё з дзейнасцю:
А) П. Мсціслаўца
Б) І. Фёдарава
В) Ф. Скарыны
Г) Л. Зізанія

8. Старэйшыя рукапісныя мусульманскія тэксты, напісаныя татарамі, што жывуць на Беларусі, называюцца:
А) хранографы
Б) кітабы
В) аргументы
Г) азбукоўнікі

9. Настаўленне аб працэдурах выканання рэлігійных рытуалаў мае назву:
А) Збор выпадкаў кароткі
Б) Апраўданне грэшнага чалавека перад богам
В) Евангелле вучыцельнае
Г) Супрасльскі рукапіс

10. Для мовы твораў палемічнай літаратуры было НЕ характэрна:
А) паслядоўнае адлюстраванне рыс жывой гаворкі
Б) частае выкарыстанне архаізмаў
В) шырокае пранікненне паланізмаў
Г) ужыванне ўкраінізмаў

13 блок
РАЗВІЦЦЁ МОВАЗНАЎСТВА НА БЕЛАРУСІ Ў XVI–XVII стст.

1. Друкаваныя азбукі і буквары кан. XVI ст. прызначаліся служыць практычнымі дапаможнікамі пры вывучэнні:
А) царкоўнаславянскай мовы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) стараславянскай мовы
В) старабеларускай мовы
Г) лацінскай мовы

2. Аўтарам першай азбукі, якая выйшла ў Львове ў 1574 г., быў:
А) Л. Зізаній
Б) Ф. Скарына
В) І. Фёдараў
Г) М. Сматрыцкі

3. Буквар "Начало учениа детем" (1593 г.) быў выдадзены:
А) у Магілёўскай брацкай друкарні
Б) у друкарні братоў Мамонічаў
В) у Нясвіжскай друкарні
Г) у Астрожскай друкарні

4. У Куцеінскай друкарні выдаў свой "Буквар":
А) С. Будны
Б) Л. Крышкоўскі
В) І. Ужэвіч
Г) С. Собаль

5. Аўтарам буквара, па якім вучыліся дзеці царскай сям'і, быў:
А) М. Кавячынскі
Б) С. Полацкі
В) А. Смаленскі
Г) Ф. Багушэвіч

6. Першы друкаваны слоўнік усходніх славян – гэта:
А) "Лексиконъ славенороссский" П. Бярынды
Б) "Лексис" Л.Зізанія
В) "Лексисъ съ толкованиемъ словенскихъ мовъ просто"
Г) "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" ў 5-ці тамах

7. Лічыцца, што ўпершыню ў гісторыі выдавецкай справы назву "Буквар" выкарыстаў:
А) С. Собаль
Б) Л. Зізаній
В) С. Полацкі
Г) М. Сматрыцкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8. Першая друкаваная граматыка была выдадзена:
А) Л. Зізаніем
Б) І. Ужэвічам
В) друкарняй братоў Мамонічаў
Г) М. Сматрыцкім

9. Тлумачальны матэрыял "Граматыкі славенскай" І. Ужэвіча напісаны на:
А) лацінскай мове
Б) украінскай мове
В) польскай мове
Г) царкоўнаславянскай мове

10. Адным з асноўных падручнікаў для вывучэння царкоўнаславянскай мовы была "Граматыка":
А) І. Ужэвіча
Б) Б. Тарашкевіча
В) І. Фёдарава
Г) М. Сматрыцкага

14 блок
УЗНІКНЕННЕ І РАСПАЎСЮДЖАННЕ КНІГАДРУКАВАННЯ

1. Першай еўрапейскай краінай, дзе ўзнікла кнігадрукаванне, была:
А) Італія В) Францыя
Б) Германія В) Галандыя

2. Друкарскі станок вынайшаў:
А) Ё. Гутэнберг
Б) Ф. Скарына
В) Ш. Феоль
Г) І. Ужэвіч

3. Усходнеславянскім першадрукаром з'яўляецца:
А) Б. Тарашкевіч
Б) Ф. Скарына
В) С. Будны
Г) К. Тураўскі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Першая друкаваная кніга Ф. Скарыны "Псалтыр" выйшла ў 1517 г. у:

А) Празе
Б) Мілане
В) Вільні
Г) Полацку

5. Апошнія з вядомых друкаваных кніг Ф. Скарыны выйшлі ў:

А) Полацку
Б) Кракаве
В) Вільні
Г) Варшаве

6. На тэрыторыі Беларусі НЕ дзейнічала:

А) Астрожская друкарня
Б) Нясвіжская друкарня
В) Брэсцкая друкарня
Г) Куцеінская друкарня

7. Найбольш доўгі час з усіх прыватных друкарняў дзейнічала:

А) Заблудаўская друкарня
Б) друкарня братоў Мамонічаў у Вільні
В) Нясвіжская друкарня
Г) друкарня Ф. Скарыны ў Вільні

8. Першыя кірылічныя выданні на тэрыторыі Беларусі выйшлі ў:

А) Куцеінскай друкарні
Б) Любчанскай друкарні
В) Лоскай друкарні
Г) Нясвіжскай друкарні

9. Да выданняў друкарні братоў Мамонічаў НЕ адносіцца:

А) Статут 1588 г.
Б) Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам
В) Трыбунал абываццелям ВКЛ
Г) Евангелле напрастольнае

10. Заснавальнікам Куцеінскай друкарні пад Оршай з'яўляецца:

А) С. Собаль
Б) Ф. Скарына
В) І. Капіевіч
Г) С. Будны

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15 блок
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА
XVII–XVIII стст.

1. Заняпад старабеларускага пісьменства пачаўся з абмежаванага выкарыстання беларускай мовы ў:

А) дзелавой пісьменнасці
Б) літаратурна-мастацкіх творах
В) летапісанні
Г) навуковай і палемічнай літаратуры

2. Літоўцы імкнуліся да замены афіцыйнай беларускай мовы:

А) сербскай
Б) лацінскай
В) нямецкай
Г) украінскай

3. У 1696 г. сейм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову, якая забараніла карыстацца беларускай мовай:

А) пры напісанні твораў мастацкай літаратуры
Б) у прыватнай перапісцы
В) у афіцыйнай перапісцы
Г) пры перакладах рэлігійнай літаратуры

4. Літаратурная мова на Беларусі к кан. XVII ст.:

А) паланізавалася
Б) зблізілася з народна-дыялектнай
В) русіфікавалася
Г) трапіла пад уплыў латыні

5. Старабеларуская мова ў XVII ст. НЕ выкарыстоўвалася:

А) у набажэнстве
Б) пры друкаванні рэлігійных кніг
В) у афіцыйнай перапісцы
Г) у асяроддзі простага народа

6. Для мовы помнікаў свецкай пісьменнасці XVII ст., напрыклад, для Статута полацкага брацтва (1651 г.), характэрна:

А) насычэнне паланізмамі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) насычэнне царкоўнаславянскай лексікай
В) шырокае адлюстраванне беларусізмаў
Г) пераважнае ўжыванне ўкраінізмаў

7. Да фанетычных і граматычных царкоўнаславянізмаў, шырока прадстаўленых у "Зборы выпадкаў кароткім" (1722), НЕ адносіцца:
А) дщерь
Б) солию (Т. скл., ж.р.)
В) ветхаго
Г) маючи

8. Пісьмовую фіксацыю беларуская мова XVIII ст. атрымала галоўным чынам у:
А) помніках юрыдычна-дзелавога пісьменства
Б) тагачасных школьных падручніках
В) інтэрмедыях і інтэрлюдыях да драматычных твораў
Г) рэлігійнай літаратуры

9. Сістэмай лексічных і графіка-арфаграфічных сродкаў інтэрмедыі збліжаюцца з:
А) творамі беларускай літаратуры 1-й пал. XIX ст.
Б) рэлігійнай літаратурай старабеларускага перыяду
В) выданнямі Ф. Скарыны
Г) беларуска-літоўскімі летапісамі

10. Да рыс жывой беларускай гаворкі, адлюстраваных у інтэрмедыях, НЕ адносіцца:
А) ужыванне прыметнікаў з канчаткам *-ы*
Б) замена шыпячых *ж, ч, ш* на свісцячыя *з, ц, с*
В) дзеканне
Г) цеканне

16 блок
ГІСТАРЫЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Новая беларуская літаратурная мова пачынае сваю гісторыю з:
А) XIV ст.
Б) XVI ст.
В) XIX ст.
Г) XX ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Новая беларуская літаратурная мова сфарміравалася на аснове:
А) жывой беларускай гаворкі
Б) традыцый старажытнарускай кніжнасці
В) старабеларускай літаратурнай мовы
Г) стараславянскай мовы

3. У аснову фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы ляглі гаворкі:
А) паўночна-ўсходняй часткі Беларусі
Б) беларускага Палесся
В) цэнтральнай Беларусі
Г) паўднёва-заходняй часткі Беларусі

4. Ля вытокаў стварэння новай беларускай літаратурнай мовы стаялі:
А) беларускія вучоныя-мовазнаўцы
Б) польскія пісьменнікі
В) рускія і польскія вучоныя-мовазнаўцы
Г) беларускія паэты і пісьменнікі

5. Новая беларуская літаратурная мова фарміруецца ў сферы:
А) мастацкай літаратуры
Б) дзелавога пісьменства
В) канфесійнай літаратуры
Г) публіцыстыкі

6. Афіцыйнай мовай на Беларусі ў 1-й пал. XIX ст. была:
А) беларуская
Б) руская
В) польская
Г) яўрэйская

7. У 1-й пал. XIX ст. свае творы пісалі на беларускай мове:
А) Я. Чачот
Б) М. Багдановіч
В) З. Бядуля
Г) Я. Купала

8. На пачатку XIX ст. Беларусь:
А) мела дзяржаўную самастойнасць
Б) знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай
Г) знаходзілася ў складзе Вялікага Княства Літоўскага

9. Для мовы беларускай народнасці 1-й пал. XIX ст. НЕ характэрна:
А) раздробленне на мноства дыялектаў
Б) неўпарадкаванасць
В) выкарыстанне пераважна сялянствам
Г) наяўнасць сталых агульнапрынятых норм

10. Пісьмовая беларуская літаратурная мова фарміравалася:
А) на працягу трох дзесяцігоддзяў
Б) больш за дзесяцігоддзе
В) больш за стагоддзе
Г) паўстагоддзя

17 блок
АНАНІМНАЯ ЛІТАРАТУРА 1-й ПАЛОВЫ XIX ст.

1. Да ананімных твораў 1-й пал. XIX ст. НЕ адносяцца:
А) вершаванае апавяданне "Тэатр"
Б) "Ой, вясніца-вясна"
В) "Мужыцкая праўда"
Г) "Вось які цяпер люд стаў"

2. Ананімныя гутаркі 1-й пал. XIX ст. – гэта творы:
А) мастацкай публіцыстыкі
Б) патрыятычнай публіцыстыкі
В) юрыдычна-прававога зместу
Г) рэлігійнай накіраванасці

3. Спіс выданняў, друкаваных у 1-й пал. XIX ст. на беларускай мове, пачынаецца з:
А) газеты "Мужыцкая праўда"
Б) рымска-каталіцкага катэхізіса 1835 г.
В) твораў В. Дуніна-Марцінкевіча
Г) "Нашай Нівы"

4. Ананімныя гутаркі 1-й пал. XIX ст. пісаліся ў асноўным на:
А) сацыяльна-бытавыя тэмы
Б) грамадска-палітычныя тэмы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) рэлігійныя тэмы
Г) юрыдычна-прававыя тэмы

5. Да анашімных твораў 1-й пал. XIX ст. адносіцца:
А) "Пісьмо з-пад шыбеніцы"
Б) "Зайграй, зайграй, хлопча малы"
В) "Сялянская ідылія"
Г) "Вясна гола перапала"

6. Мова ананімных твораў 1-й пал. XIX ст. – гэта:
А) жывая гутарковая мова беларускага селяніна
Б) моцна паланізаваная мова
В) старабеларуская літаратурная мова
Г) латынь

7. Паэма "Энеіда навыварат" упершыню была апублікавана:
А) часопісам "Полымя"
Б) часопісам "Маяк"
В) газетай "Мінскі лісток"
Г) часопісам "Вожык"

8. Паэма "Тарас на Парнасе" ўпершыню была апублікавана:
А) газетай "Беларусь"
Б) часопісам "Маладосць"
В) газетай "Мінскі лісток"
Г) часопісам "Раніца"

9. Палітычныя падзеі кан. XVIII – 1-й пал. XIX стст. знайшлі водгук у ананімным творы:
А) "Песня беларускіх жаўнераў"
Б) "Прачыстая сярод ночы"
В) "Тэатр"
Г) "Вясна гола перапала"

10. На беларускай мове ў 1-й пал. XIX ст. НЕ дазвалялася друкаваць:
А) аўтарскія мастацкія творы
Б) фальклорныя творы
В) гістарычныя дакументы
Г) помнікі пісьменства

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

18 блок
АЎТАРСКІЯ ТВОРЫ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ 1-й ПАЛОВЫ XIX ст.

1. Характэрнай рысай аўтарскіх твораў пач. XIX ст., напісаных на беларускай мове, была іх відавочная сувязь з:

А) гаворкай аўтара
Б) цэнтральнымі беларускімі гаворкамі
В) польскай мовай
Г) мовай украінскай народнасці

2. Найбольш рэальны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай літаратурнай мовы аказалі пісьменнікі:

А) старэйшага пакалення
Б) выхадцы з сялянства
В) гаворка якіх была бліжэй да моўнай стыхіі цэнтральнай Беларусі
Г) якія пісалі свае творы лацінскай графікай

3. У 1-й пал. XIX ст. на беларускай мове пісалі свае творы:

А) Ф. Багушэвіч
Б) Я. Брыль
В) Я. Лучына
Г) Я. Баршчэўскі

4. У вершы П. Багрыма "Зайграй, зайграй, хлопча малы" з рыс, не ўласцівых жывой народнай гаворцы, адлюстраваны:

А) захаванне ненаціскнога э пасля шыпячых
Б) яканне
В) дзеканне
Г) канчатак *-ы* ў прыметніках м.р. адз. ліку Н. скл.

5. Для твораў Я. Чачота характэрна:

А) поўнае недысімілятыўнае аканне
Б) адлюстраванне акання толькі ў пераднаціскных складах
В) адлюстраванне якання
Г) наяўнасць прыстаўнога *в*

6. Наяўнасць вузкамясцовых лексем і слоў, агульных з рускай мовай, асабліва характэрна для твораў пісьменнікаў 1-й пал. XIX ст.:

А) Я. Баршчэўскага і А. Рыпінскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) В. Дуніна-Марцішкевіча і А. Гурыновіча
В) Ф. Багушэвіча і Я. Лучыны
Г) Я. Купалы і Я. Коласа

7. Пад уплывам польскай мовы ў беларускамоўных аўтарскіх творах 1-й пал. XIX ст.:
А) адсутнічаюць прыстаўныя галосныя
Б) непаслядоўна перадаецца аканне
В) ужываецца зваротная часціца *-sie (-се)*
Г) не ўжываюцца прыстаўныя зычныя

8. Кірыліцай (грамадзянскім шрыфтам) напісаны:
А) верш П. Багрыма "Зайграй, зайграй, хлопча малы"
Б) вершы Я. Чачота
В) паэма "Шчароўскія дажынкі" В. Дуніна-Марцінкевіча
Г) паэма "Тарас на Парнасе"

9. Вывучэннем этнаграфіі Беларусі і беларускай мовы займаўся:
А) Я. Баршчэўскі
Б) Я. Чачот
В) П. Багрым
Г) А. Рыпінскі

10. Спрабаваў стварыць слоўнік беларускай мовы:
А) Я. Чачот
Б) В. Дунін-Марцінкевіч
В) А. Рыпінскі
Г) А. Плуг

19 блок
РОЛЯ В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА Ў ФАРМІРАВАННІ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Пачаўшы пісаць па-беларуску, В. Дунін-Марцінкевіч звярнуўся ў пошуках патрэбнага слова ў першую чаргу:
А) да творчасці сваіх папярэднікаў
Б) да багацця роднай гаворкі
В) да моўных здабыткаў Ф. Багушэвіча
Г) да творчасці польскіх аўтараў

2. У творах В. Дуніна-Марцінкевіча даволі паслядоўна адлюстравана такая рыса беларускай мовы, як:
А) ужыванне *ж* на месцы афрыкаты *дж*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) адсутнасць падваення *н'*
В) непаслядоўнае ўжыванне прыстаўных галосных
Г) зацвярдзенне гука *р*

3. Сучаснікі (У. Сыракомля, А. Плуг) крытыкавалі В. Дуніна-Марцінкевіча за:
А) злоўжыванне запазычаннямі
Б) ужыванне вузкіх дыялектызмаў
В) непаслядоўнае адлюстраванне рыс беларускай мовы
Г) нядбайнае стаўленне да беларускай мовы

4. В. Дунін-Марцінкевіч пісаў свае творы:
А) на польскай і беларускай мовах
Б) толькі на беларускай мове
В) толькі на польскай мове
Г) толькі грамадзянскім шрыфтам

5. Першым творам В. Дуніна-Марцінкевіча, у якім ён звярнуўся да беларускай мовы, быў:
А) "Пінская шляхта"
Б) "Гапон"
В) "Сялянка"
Г) "Шчароўскія дажынкі"

6. В. Дунін-Марцінкевіч пераклаў на беларускую мову:
А) апавяданне У. Гаршына "Сігнал"
Б) байку Крылова "Свіння і жалуды"
В) паэму А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш"
Г) вершы Някрасава

7. Роднымі для В. Дуніна-Марцінкевіча былі:
А) палескія гаворкі
Б) гаворкі цэнтральнай Беларусі
В) паўночна-ўсходнія гаворкі
Г) паўднёва-заходнія гаворкі

8. Да паланізмаў у творах В. Дуніна-Марцінкевіча НЕ адносіцца лексема:
А) бэндзе
Б) кляштар

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) нех
Г) прадвяшчаць

9. Да русізмаў у творах В. Дуніна-Марцінкевіча НЕ адносіцца лексема:
А) бальшы
Б) вялець
В) тлусты
Г) абсуждаць

10. Уплывам польскай мовы абумоўлена наяўнасць у творах В. Дуніна-Марцінкевіча:
А) дзекання і цекання
Б) цвёрдасці шыпячых
В) гука *і* ў спалучэннях губных зычных з *j* (ётам)
Г) акання

20 блок
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА 2-й ПАЛОВЫ XIX ст.

1. Фарміраванне беларускай мовы ў 60-я гг. XIX ст. адбывалася пераважна ў жанрах:
А) мастацкай літаратуры
Б) публіцыстыкі
В) мастацкай літаратуры і публіцыстыкі
Г) навукова-папулярнай літаратуры

2. Для твораў беларускай літаратуры 2-й пал. XIX ст. НЕ характэрна:
А) моўна-стылістычная аднастайнасць
Б) абмежаванасць навуковай лексікі
В) абмежаванасць кніжнай абстрактнай лексікі
Г) выкарыстанне адзінай графікі

3. Для слоўнікавага складу беларускай мовы 2-й пал. XIX ст. характэрна:
А) перавага слоў, звязаных з паняццямі штодзённага побыту
Б) наяўнасць значнай колькасці навуковых тэрмінаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) шырокае ўжыванне інтэрнацыянальнай лексікі
Г) значная колькасць абстрактнай лексікі

4. На беларускай мове ў 2-й пал. XIX ст. забаранялася друкаваць:
А) фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы
Б) помнікі пісьменства
В) гістарычныя дакументы
Г) любыя іншыя выданні "лаціна-польскімі літарамі"

5. Да публікацый афіцыйнага напрамку 2-й пал. XIX ст. НЕ адносіцца:
А) "Мужыцкая праўда"
Б) "Бяседа старога вольніка з новымі"
В) "Прамова Старавойта"
Г) "Апавяданні на беларускім нарэччы"

6. Да беларускай вучэбнай літаратуры 2-й пал. XIX ст. можна аднесці:
А) "Беларускі лемантар або Першая навука чытання" К. Каганца
Б) "Лемантар для добрых дзетак католікаў"
В) "Першае чытанне для дзетак беларусаў" Цёткі
Г) "Беларускую граматыку для школ" Б. Тарашкевіча

7. Пасля задушэння паўстання 1863 г. адбыліся наступныя змены ў жанравым развіцці беларускай пісьменнасці:
А) амаль знікла публіцыстыка
Б) паэзія перастае быць пануючым жанрам
Г) узнік раман
Д) пануючым жанрам становіцца апавяданне

8. У 2-й пал. XIX ст. узнікае новы энічны жанр мастацкай літаратуры:
А) аповесць
Б) раман
В) апавяданне
Г) трагедыя

9. У 2-й пал. XIX ст. на беларускай мове свае творы НЕ пісаў:
А) Ф. Багушэвіч
Б) А. Гурыновіч

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) Я. Лучына
Г) Я. Чачот

10. Лацінскай графікай НЕ пісаў свае творы:
А) Я. Лучына
Б) Ф. Багушэвіч
В) А. Гурыновіч
Г) А. Абуховіч

21 блок
РОЛЯ Ф. БАГУШЭВІЧА Ў ФАРМІРАВАННІ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Творамі Ф. Багушэвіча НЕ з'яўляюцца:
А) апавяданне "Тралялёначка"
Б) зборнік вершаў "Вязанка"
В) зборнік вершаў "Дудка беларуская"
Г) зборнік вершаў "Смык беларускі"

2. Ф. Багушэвіч адным з першых сярод беларускіх пісьменнікаў XIX ст. гаварыў пра беларускую мову як:
А) найважнейшы элемент нацыянальнай культуры
Б) дыялектную, што не мае літаратурнай апрацоўкі
В) дыялект польскай мовы
Г) дыялект рускай мовы

3. Акрамя напісання твораў мастацкай літаратуры, Ф. Багушэвіч:
А) займаўся этнаграфіяй
Б) збіраў беларускі фальклор
В) рыхтаваў картатэку слоўніка беларускай мовы
Г) займаўся перакладчыцкай дзейнасцю

4. Нярэдкім паланізмам у творах Ф. Багушэвіча з'яўляецца:
А) ужыванне Н. скл. назоўнікаў пры дзеясловах, якія патрабуюць Р. скл. (*а грошы ня стала*)
Б) ужыванне зваротнай часціцы ў кароткай форме (*надумаўсь*)
В) ужыванне гукаперайміальных дзеясловаў-выклічнікаў (*шусць, трэсь*)
Г) ужыванне Р. скл. назоўнікаў замест В. скл. (*б'ець у звона*)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. У творах Ф. Багушэвіча амаль НЕ адлюстраваны:

А) тэрытарыяльна абмежаваныя словы

Б) паланізмы

В) запазычанні з рускай мовы

Г) украінізмы

6. Да вузкіх дыялектызмаў, прадстаўленых у лексіцы твораў Ф. Багушэвіча, НЕ адносяцца:

А) зыдаль

Б) абяцаць

В) прыварак

Г) гіпёс

7. У творах Ф. Багушэвіча часцей сустракаюцца запазычанні з:

А) польскай мовы

Б) рускай мовы

В) украінскай мовы

Г) іншых моў

8. У граматычных і правапісных адносінах з творамі Ф. Багушэвіча зближаецца:

А) "Мужыцкая праўда"

Б) "Энеіда навыварат"

В) "Дзядзька Антон"

Г) "Прамова Старавойта"

9. Сучаснікам і паслядоўнікам Ф. Багушэвіча з'яўляецца:

А) П. Багрым

Б) А. Гурыновіч

В) Я. Баршчэўскі

Г) Я. Чачот

10. Да прастамоўнай лексікі, прадстаўленай у творах Ф. Багушэвіча, НЕ адносіцца лексема:

А) морда

Б) кудлы

В) брахаць

Г) жывот

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

22 блок
ПУБЛІЦЫСТЫКА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў 2-й ПАЛОВЕ XIX ст.

1. Да публіцыстычных выданняў 2-й пал. XIX ст. НЕ адносяцца:
А) гутаркі
Б) "Мужыцкая праўда"
В) прадмова Ф. Багушэвіча да зборніка "Дудка беларуская"
Г) апавяданне Ф. Багушэвіча "Тралялёначка"

2. Лепшымі ўзорамі публіцыстыкі 2-й пал. XIX ст. лічацца:
А) "Перадсмяротная гутарка"
Б) "Мужыцкая праўда" і "Пісьмо з-пад шыбеніцы" К. Каліноўскага
В) "Гутарка старога дзеда"
Г) "Прамова Старавойта"

3. Для лексікі публіцыстычных выданняў 2-й пал. XIX ст. НЕ характэрна:
А) шырокае выкарыстанне інтэрнацыянальных слоў
Б) шырокае выкарыстанне вобразных параўнанняў
В) ужыванне вульгарных і прастамоўных слоў
Г) ужыванне паланізмаў

4. З рыс, характэрных для жывой беларускай гаворкі, у творах К. Каліноўскага амаль НЕ перадаецца:
А) аканне
Б) дзеканне
В) цеканне
Г) яканне

5. Сёмы нумар "Мужыцкай праўды" адрозніваецца ад папярэдніх шасці і "Пісьма з-пад шыбеніцы":
А) наяўнасцю якання
Б) амаль поўнай адсутнасцю акання
В) адсутнасцю падоўжаных зычных
Г) наяўнасцю зацвярдзелых шыпячых

6. З вузкамясцовых рыс у творах К. Каліноўскага адлюстравана:
А) ужыванне інфінітываў на *-ці*
Б) зацвярдзенне *р*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) асіміляцыйнае змякчэнне зычных
г) змяненне *л* на *ў*

7. Да гутарак, што ўзніклі ў 2-й пал. XIX ст., не адносяцца:
А) "Сход"
Б) "Панская ласка"
В) "Гутарка старога дзеда"
Г) "Ой, вясніца-вясна"

8. Публіцыстычнае гучанне ў 2-й пал. XIX ст. НЕ набыло словазлучэнне:
А) здабыць свабоду
Б) выказацца за вольнасць
В) карміць дзяцей
Г) мужыцкая праўда

9. З украінскай мовы ў 2-й пал. XIX ст. была перакладзена гутарка:
А) "Сход"
Б) "Пра багацце і беднасць"
В) "Размова пана з мужыком"
Г) "Панская ласка"

10. НЕ было адметнай асаблівасцю мовы публіцыстычных выданняў 2-й пал. XIX ст.:
А) шырокае выкарыстанне тагачаснай грамадска-палітычнай лексікі
Б) выкарыстанне тагачаснай канцылярска-юрыдычнай тэрміналогіі
В) замацаванне пашыраных у народзе слоў з тэрміналагічным значэннем
Г) выкарыстанне пераважна простых сінтаксічных канструкцый

23 блок
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА ПАЧАТКУ XX ст.

1. Беларуская мова склалася як літаратурная:
А) у 1-й пал. XIX ст.
Б) у 2-й пал. XIX ст.
В) у пач. XX ст.
Г) у 2-й пал. XX ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Закон аб свабодзе друку быў выдадзены ў:
А) 1905 г.
Б) 1917 г.
В) 1918 г.
Г) 1933 г.

3. Закон аб свабодзе друку дазваляў друкаваць:
А) фальклорныя матэрыялы на беларускай мове
Б) гістарычныя дакументы
В) арыгінальныя творы бел. літаратуры і пераклады на бел. мову з інш. моў
Г) этнаграфічныя матэрыялы

4. Беларуская мова на пач. XX ст. дапускалася ў:
А) навуку
Б) творы мастацкай літаратуры
В) школу
Г) грамадска-культурнае і палітычнае жыццё

5. Першым легальным выдавецтвам з'яўляецца:
А) "Мінчук"
Б) "Наша ніва"
В) "Наша хата"
Г) "Загляне сонца і ў наша ваконца"

6. Першыя падручнікі на роднай мове (т.зв. лемантары, чытанкі) выйшлі ў выдавецтве:
А) "Загляне сонца і ў наша ваконца"
Б) "Наша ніва"
В) "Палачанін"
Г) "Беларускае выдавецкае таварыства"

7. Аўтарам першых падручнікаў на роднай мове НЕ з'яўляецца:
А) К. Каганец
Б) Ядвігін Ш.
В) Цётка
Г) Я. Колас

8. На пач. XX ст. (да Кастрычніцкай рэвалюцыі) на беларускай мове выйшла:
А) каля 20 выданняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Б) каля 50 выданняў
В) звыш 200 выданняў
Г) каля тысячы выданняў

9. Беларускія выданні пач. XX ст. НЕ друкаваліся:
А) кірыліцай (грамадзянскім шрыфтам)
Б) лацінкай у яе польскім варыянце
В) лацінкай у яе чэшскім варыянце
Г) арабскім пісьмом

10. Для беларускай мовы пач. XX ст. НЕ характэрна:
А) уніфікацыя правапісу
Б) перавага фанетычнага прынцыпу правапісу
В) складванне афіцыйна-канцылярскай разнавіднасці дзелавога стылю
Г) зніжэнне сацыяльнай значнасці публіцыстыкі

24 блок
ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ДАРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЧАС

1. Належныя ўмовы для сістэматызаванага вывучэння беларускай мовы склаліся:
А) у канцы XVIII ст.
Б) у пач. XIX ст.
В) у 2-й пал. XIX ст.
Г) пасля 1917 г.

2. Беларуская мова ў дакастрычніцкі час НЕ разглядалася як:
А) самастойная літаратурная мова
Б) дыялект рускай мовы
В) народная гаворка
Г) дыялект польскай мовы

3. З ранніх прац па беларускім мовазнаўстве ў друк трапіла:
А) граматыка К. Нядзвецкага
Б) гістарычны слоўнік І. Насовіча
В) праца К. Калайдовіча "О белорусском наречии"
Г) граматыка П. Шпілеўскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Беларуская мова НЕ ставілася поруч з іншымі славянскімі мовамі ў працах:

А) П. Бяссонава

Б) Я. Чачота

В) М. Максімовіча

Г) М. Надзеждзіна

5. Найбольш каштоўная для беларускага мовюазнаўства лексікаграфічная праца кан. XIX ст. – гэта:

А) "Словарь западнорусского наречия" І. Грыгаровіча

Б) "Словарь белорусского наречия" І. Насовіча

В) "Собрание слов литовско-русского наречия" Ф. Шымкевіча

Г) "Корнеслов русского языка" Ф. Шымкевіча

6. Сістэматызаванае вывучэнне беларускай мовы пачалося з працы:

А) Я. Карскага "Беларусы"

Б) І. Нядзёшава "Исторический обзор важнейших … особенностей белорусской речи"

В) К. Апеля "О белорусском наречии"

Г) К. Калайдовіча "О белорусском наречии"

7. На працягу 1890–1893 гг. Я. Карскі апублікаваў сваё даследаванне:

А) "К гісторыі гукаў і форм беларускай гаворкі"

Б) "Беларусы"

В) "Беларускія песні сяла Бярозаўца"

Г) "Заходнярускія пераклады Псалтыра ў XV–XVII стст."

8. Найбольшы ўклад у распрацоўку пытанняў гісторыі беларускай мовы зрабіў:

А) А. Сабалеўскі

Б) К. Калайдовіч

В) Я. Карскі

Г) К. Апель

9. Каму з вучоных-філолагаў удалося, абапіраючыся на навуковыя факты, даказаць, што беларуская мова – раўнапраўная сярод іншых славянскіх моў:

А) Я. Карскаму

Б) І. Насовічу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В) А. Шахматаву
Г) В. Вінаградаву

10. "Этнагфічная карта беларускага племені" змешчана:
А) у "Смаленскім абласным слоўніку" У. Дабравольскага
Б) у першым томе "Беларусаў" Я. Карскага
В) у другім томе "Беларусаў" Я. Карскага
Г) у трэцім томе "Беларусаў" Я. Карскага

25 блок
РОЛЯ Я. КУПАЛЫ І Я. КОЛАСА Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

1. Я. Купала ўступіў у літаратурнае жыццё ў адзін час з:
А) Ф. Багушэвічам
Б) Цёткай
В) А. Гурыновічам
Г) А. Абуховічам

2. Сваю канцэпцыю развіцця літаратурнай мовы Я. Колас сфармуляваў у артыкуле:
А) "Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову"
Б) "Мова пісьменніка – мова народа"
В) "Жывая спадчына"
Г) "Роднае слова"

3. Згодна коласавай канцэпцыі развіцця літаратурнай мовы, тварэц мовы – гэта:
А) пісьменнік
Б) навукоўцы
В) інтэлігенцыя
Г) народ

4. Задача пісьменнікаў у працэсе развіцця і ўзбагачэння мовы, паводле меркаванняў Я. Коласа, заключаецца ў:
А) адборы лепшага з народнай мовы, фарміраванні літаратурнай мовы
Б) навуковай апрацоўцы народнай мовы
В) штодзённым карыстанні мовай
Г) тварэнні мовы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Галоўнай рысай, што вызначае мову твораў Я. Купалы, з'яўляецца:

А) вузкадыялектны характар

Б) сувязь з польскай мовай

В) сувязь з народнай мовай

Г) сувязь з рускай мовай

6. Я. Колас уступіў у літаратурнае жыццё:

А) у пач. XIX ст.

Б) у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст.

В) у першым дзесяцігоддзі XX ст.

Г) у 30-я гг. XX ст.

7. Што НЕ характэрна для грамадскай і літаратурнай дзейнасці Я. Купалы:

А) удзел у выпрацоўцы правапісу 1933 г.

Б) заклік да інш. пісьменнікаў змагацца за чысціню літаратурнай мовы

В) няспынная праца над мовай сваіх твораў

Г) поўнае адмаўленне ад запазычанняў

8. К часу выступлення Я. Купалы і Я. Коласа ў літаратуры, беларуская мова:

А) мела строга рэгламентаваныя нормы

Б) набыла ўсе свае рысы ў структурных адносінах

В) не функцыянавала ў сферы публіцыстыкі і навукова-папулярнай літаратуры

Г) не функцыянавала ў сферы мастацкай літаратуры

9. Для словатворчасці Я. Купалы і Я. Коласа НЕ характэрна:

А) жывая пераемнасць з пісьменнікамі папярэдняга пакалення

Б) арыентацыя на тэмы, цікавыя для народа

В) арганічнае валоданне народнай мовай

Г) арыентацыя на ўзоры літаратурных папярэднікаў

10. Праз творы Я. Купалы ў беларускую літаратурную мову ўлілася лексема:

А) яснавокі

Б) мілагучны

В) агняпасак

Г) пустазелле

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

26 блок
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА ПЕРШЫХ ПАСЛЯКАСТРЫЧНІЦКІХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ

1. У 20-я гг. XX ст. у БССР дзяржаўнымі былі абвешчаны:
А) беларуская і польская мовы
Б) беларуская і руская мовы
В) беларуская, польская і руская мовы
Г) беларуская, польская, руская і яўрэйская мовы

2. Працэс беларусізацыі НЕ прадугледжваў:
А) выцясненне рускай мовы з усіх афіцыйных сфер
Б) навукова-даследчую працу па ўсебаковым вывучэнні Беларусі
В) арганізацыю навучальных устаноў на роднай мове
Г) развіццё нацыянальнай літаратуры

3. К канцу 20-х гг. XX ст. беларуская мова была распаўсюджана:
А) толькі ў справаводстве
Б) толькі ў школьным выкладанні
В) толькі ў мастацкай літаратуры
Г) ва ўсіх вышэйназваных сферах

4. Лексіка беларускай мовы ў паслякастрычніцкі час НЕ папаўнялася за кошт:
А) стварэння новых слоў на ўласнай моўнай базе
Б) стараславянскай лексікі
В) запазычанняў з іншых моў
Г) пераасэнсавання значэння ўжо вядомых слоў

5. Арганізацыі навучання ў школах на беларускай мове ў 20-я гг. XX ст. перашкаджала:
А) забарона царскім урадам беларускай мовы
Б) нежаданне настаўнікаў выкладаць на беларускай мове
В) адсутнасць школьных падручнікаў на беларускай мове
Г) адсутнасць у вучняў жадання атрымліваць веды на беларускай мове

6. Навукова-тэрміналагічная камісія была створана пры Народным камісарыяце асветы БССР у:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А) 1917 г. В) 1919 г.
Б) 1918 г. Г) 1921 г.

7. У падрыхтоўцы выпускаў "Беларускай навуковай тэрміналогіі" НЕ прымаў удзел:
А) Я. Карскі В) Я. Лёсік
Б) М. Байкоў Г) М. Гуткоўскі

8. Супрацоўнікі Навукова-тэрміналагічнай камісіі НЕ займаліся:
А) распрацоўкай падручнікаў для пачатковай школы
Б) вызначэннем кола новых навуковых паняццяў
В) пошукам крыніц навуковай тэрміналогіі
Г) распрацоўкай прынцыпаў тэрмінатворчай працы

9. Пры стварэнні тэрміналогіі Навукова-тэрміналагічная камісія арыентавалася ў першую чаргу на:
А) інтэрнацыянальную лексіку
Б) лексіку, уласцівую народнай гаворцы
В) неалагізмы на матэрыяле роднай мовы
Г) запазычаную лексіку

10. "Пераважнай для зносін" у 20-я гг. XIX ст. была абвешчана:
А) руская мова
Б) польская мова
В) беларуская мова
Г) яўрэйская мова

27 блок
ГРАМАТЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ Ў 20–30-я гг. XX ст.

1. Беларуская мова сфарміравалася як унармаваная сістэма:
А) у 1-й пал. XIX ст.
Б) у 2-й пал. XIX ст.
В) у пач. XX ст.
Г) у XXI ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Спецыфічнай рысай беларускай графікі, што склалася на аснове грамадзянскага шрыфта, НЕ з'яўляецца:

А) наяўнасць літары *ў*

Б) наяўнасць літары *ъ*

В) адсутнасць літары *и*

Г) адсутнасць літары *щ*

3. Асноўным прынцыпам беларускага правапісу ў паслякастрычніцкі перыяд быў:

А) фанетычны

Б) марфалагічны

В) этымалагічны

Г) фанетычны для перадачы галосных, марфалагічны з адхіленнямі ў бок фанетычнага – для перадачы зычных

4. У паслякастрычніцкі час НЕ напісана граматыка:

А) П. Шпілеўскага

Б) Б. Пачобкі

В) Р. Абіхта

Г) братоў Лёсікаў

5. Самай аўтарытэтнай граматыкай 20-х гг. XX ст. стала граматыка:

А) Б. Тарашкевіча

Б) Я. Станкевіча

В) А. Смоліч

Г) А. Луцкевіча

6. Дзвюма графікамі – лацінкай і кірыліцай – пэўны час друкавалася:

А) "Лучынка"

Б) "Наша ніва"

В) "Полымя"

Г) "Маладосць"

7. "Беларуская граматыка для школ" Б. Тарашкевіча НЕ была пабудавана на фактычным матэрыяле:

А) жывой народнай гаворкі

Б) беларускіх дарэвалюцыйных выданняў

В) старабеларускіх помнікаў

Г) навуковых прац на роднай мове

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

8. Правапіс якога запазычанага слова ў сучаснай мове НЕ супадае з правапісам, прапанаваным Б. Тарашкевічам:

А) Лондан
Б) літара
В) аратар
Г) вакзал

9. Пастанова "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу" была прынята ў:

А) 1917 г.
Б) 1924 г.
В) 1933 г.
Г) 1941 г.

10. Пастанова "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу" была ўспрынята як цяжкі ўдар па яе самабытнасці:

А) Я. Коласам
Б) Я. Купалам
В) З. Бядулем
Г) беларускімі эмігранцкімі коламі

28 блок
РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ Ў 30–50-я гг. XX ст.

1. Асновай для стварэння новых падручнікаў па беларускай мове ў 30-я гг. XX ст. стаў правапіс, прапанаваны:

А) Б. Тарашкевічам
Б) Я. Коласам
В) пастановай "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу"
Г) пастановай "Аб планавым ажыццяўленні беларусізацыі"

2. Нарматыўнай у 30-я гг. XX ст., у адрозненне ад 20-х гг., НЕ была форма:

А) палём
Б) палям
В) ядзім
Г) касіце

3. У ходзе дыскусіі 1938–1939 гг. па пытаннях беларускага правапісу ўдзельнікі НЕ адзначалі:

А) заблытанасці правапісу ўласных імён і прозвішчаў
Б) суб'ектыўнасці правапісу складаных слоў
В) неабходнасці ліквідацыі дублетных форм

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Г) неправамернасці вылучэння рэвалюцыйна-пітэрнацыянальных слоў у асобную групу адносна адлюстравання акання на пісьме

4. Некаторыя ўдзельнікі дыскусіі 1938–1939 гг. па пытаннях беларускага правапісу (К. Гурскі, П. Дзік) прапаноўвалі адмовіцца ад:

А) перадачы на пісьме дзекання

Б) перадачы на пісьме акання і якання

В) перадачы на пісьме цекання

Г) перадачы на пісьме зацвярдзення шыпячых

5. Падручнікі беларускай мовы ў 40-я гг. XX ст.:

А) поўнасцю размяжоўваюць паняцці "літаратурная мова" і "мова мастацкай літаратуры"

Б) не дапускаюць дублетнасці граматычных форм тыпу *бураў – бур*

В) не дапускаюць дублетнасці граматычных форм тыпу *слязамі – слязьмі*

Г) недастаткова размяжоўваюць паняцці "літаратурная мова" і "мова мастацкай літаратуры"

6. Найбольш актуальным пытаннем развіцця беларускай літаратурнай мовы ў 40-я гг. XX ст. была праблема:

А) словазмянення

Б) ліквідацыі іншамоўных уплываў

В) правапісу

Г) распрацоўкі тэрміналагічных слоўнікаў

7. Пачатак дыскусіі па праблемах арфаграфіі ў 40-я гг. XX ст. быў пакладзены артыкулам "Да пытанняў аб беларускім правапісе":

А) М. Судніка

Б) Я. Коласа

В) Б. Тарашкевіча

Г) М. Абабуркі

8. Хто кіраваў працай Арфаграфічнай камісіі, якая ў 1951 г. апублікавала "Праект змен і ўдакладненняў беларускага правапісу":

А) Я. Купала

Б) Я. Колас

В) М. Суднік

Г) В. Красней

9. Пастанова "Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу" была прынята ў:

А) 1953 г.

Б) 1955 г.

В) 1956 г.

Г) 1957 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Да ўвядзення ў практыку "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", зацверджаных у 2008 г., выкарыстоўваліся "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", выдадзеныя ў:

А) 1958 г. В) 1960 г.
Б) 1959 г. Г) 1961 г.

29 блок
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI стст.

1. Калі быў прыняты закон "Аб мовах у БССР":

А) 1989 г. Б) 1990 г. В) 1991 г.

2. Паводле закона "Аб мовах у БССР" статус дзяржаўнай надаваўся:

А) беларускай мове
Б) рускай мове
В) беларускай і рускай мовам

3. НЕ ўваходзіў у склад камісіі па распрацоўцы праекта закона "Аб мовах у БССР":

А) Н. Гілевіч
Б) М. Яўневіч
В) Б. Тарашкевіч

4. Праект закона "Аб мовах у БССР" шырока НЕ абмяркоўваўся:

А) у расійскім перыядычным друку
Б) у беларускіх сродках масавай інфармацыі
В) у рэспубліканскіх грамадскіх арганізацыях і установах

5. Паводле закона "Аб мовах у БССР" беларуская мова павінна была стаць мовай судовага справаводства на працягу:

А) 1 года
Б) 5 гадоў
В) 10 гадоў

6. У Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнымі прызнаны дзве мовы пасля майскага рэферэндуму:

А) 1993 г. Б) 1994 г. В) 1995 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Найбольшы тэрмін (10 гадоў) паводле закона "Аб мовах у БССР" адводзіўся на замацаванне беларускай мове ў сферы:

А) судовага справаводства, атрымання адукацыі на роднай мове

Б) навукі, культуры, масавай інфармацыі

В) абслугоўвання

8. Па даных апошняга перапісу насельніцтва беларускую мову прызнаюць роднай:

А) палова насельніцтва Беларусі

Б) больш за палову насельніцтва Беларусі

В) менш за палову насельніцтва Беларусі

9. Паводле закона "Аб мовах у БССР" руская мова кваліфікавалася як:

А) адна з дзяржаўных

Б) адзіная дзяржаўная

В) мова міжнацыянальных зносін

10. Па даных ЮНЭСКА беларуская мова на сучасны момант:

А) знаходзіцца пад пагрозай знікнення

Б) шырока выкарыстоўваецца ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця

В) з'яўляецца мовай міжнацыянальных зносін

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ЗМЕСТ

1 блок. Уводзіны 3

2 блок. Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы 5

3 блок. Навуковая распрацоўка гісторыі беларускай літаратурнай мовы 7

4 блок. Узнікненне пісьменнасці ва ўсходніх славян. Паходжанне старажытнарускай мовы 8

5 блок. Царкоўнаславянская кніжнасць старажытнага перыяду 10

6 блок. Апавядальна-гістарычная літаратура старажытнага перыяду 12

7 блок. Дзелавое пісьменства старажытнага перыяду 13

8 блок. Пісьменства на тэрыторыі Беларусі XII–XIII стст. Мясцовыя рысы ў пісьмовых помніках асобных рэгіёнаў 15

9 блок. Утварэнне беларускай народнасці і яе мовы 17

10 блок. Дзелавое і юрыдычнае пісьменства старабеларускага перыяду 18

11 блок. Літаратурна-мастацкія творы, летапісы, мемуарная літаратура старабеларускага перыяду 20

12 блок. Рэлігійная літаратура старабеларускага перыяду 22

13 блок. Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў XVI–XVII стст. 23

14 блок. Узнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання 25

15 блок. Беларуская літаратурная мова XVII–XVIII стст. 27

16 блок. Гістарычныя ўмовы фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы 28

17 блок. Ананімная літаратура 1-й паловы XIX ст. 30

18 блок. Аўтарскія творы на беларускай мове 1-й паловы XIX ст. 32

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

19 блок. Роля В. Дуніна-Марцінкевіча ў фарміраванні новай беларускай літаратурнай мовы 33

20 блок. Беларуская літаратурная мова 2-й паловы XIX ст. 35

21 блок. Роля Ф. Багушэвіча ў фарміраванні новай беларускай літаратурнай мовы 37

22 блок. Публіцыстыка на беларускай мове ў 2-й палове XIX ст. 39

23 блок. Беларуская літаратурная мова пачатку XX ст. 40

24 блок. Вывучэнне беларускай мовы ў дарэвалюцыйны час 42

25 блок. Роля Я. Купалы і Я. Коласа ў развіцці беларускай літаратурнай мовы 44

26 блок. Беларуская літаратурная мова першых паслякастрычніцкіх дзесяцігоддзяў 46

27 блок. Граматычная распрацоўка новай беларускай літаратурнай мовы ў 20–30-я гг. XX ст. 47

28 блок. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў 30–50-я гг. XX ст. 49

29 блок. Беларуская літаратурная мова канца XX – пачатку XXI стст. 51

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

Карпечкіна Дзіна Аляксееўна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Кантрольныя заданні

Тэхнічны рэдактар *А. Л. Пазнякоў*
Камп'ютарная вёрстка *Н. У. Герман.*

Падпісана да друку 12.11.2014. Фармат 60x84/16.
Гарнітура Times New Roman. Ум.-друк. арк. 3,25.
Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 62 экз. Заказ № 389.

Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі МДУ імя А. А. Куляшова. 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова